форматорские цели. В 1953 г. целью было падение режима и воссоединение с ФРГ. Но с появлением советских танков произошло быстрое отрезвление, и последующие недели целью было освобождение из тюрем арестованных товарищей.

В 1989 г. целью были реформы, отставка Хонеккера, ослабление роли госбезопасности, свободные выборы. О воссоединении, рыночной экономике, частной собственности упоминалось нечасто. Но события вокруг Берлинской стены, работа «Круглых столов» постепенно привели к нарастанию революционных требований, к успеху революции, к поражению социализма.

Подводя итог, нужно сказать, что без событий 17 июня 1953 г. не было бы успеха революции 1989 г. Страх перед рабочими, недоверие к народу постоянно присутствовали у руководителей ГДР. Отсюда гипертрофированное развитие органов госбезопасности (Штази), боязнь признать свои очевидные ошибки, а в итоге - полная неспособность приспосабливаться к изменению условий, без чего невозможно существование любой системы. Этот страх проявился в приказах полиции, госбезопасности не «рассердить» своими действиями массы населения.

Последствия 17 июня сказывались также и на противоположной стороне. Они помнили о жестокости режима, что объединяло их, порождало массовые гражданские движения, лишало режим социальной базы, привело к его падению, успеху бескровной революции, исчезновению «социалистического» государства.


1. Walter SuB. Von der Ohnmacht des Volkes zur Resignation der Machtigen. Der Aufstand von 1953 und die Revolution von 1989. – Vierteljahr Shefte fur Zeitgeschichte. 52. Jahrgang, / Heft / 3 Juli, 2004.
2. Ахтамзян А. А. Объединение Германии, или Аншлюс ГДР к ФРГ. – М., 1994.
3. Последний год ГДР. – М., 1993.



*Мязга М. М. (г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны)*


## ПАЛІТЫКА РАПАЛА Ў ПОЛЬСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

Імкненне да перагляду Версальскага дагавора, да рэваншу за паражэнне ў першай сусветнай вайне з'яўлялася цэнтральным элементам знешняй палітыкі Веймарскай Германіі. Пры гэтым яна імкнулася заручыцца падтрымкай іншых дзяржаў. Адным з найбольш актыўных праціўнікаў Версальскай сітэмы ў 1920-я гг. з'яўлялася Савецкая Расія. Непрыняцце версальскага дыктату Берлінам і Масквою стала аб'ектыўнай асновай для збліжэння паміж імі, вынікам якога стала заключэнне Рапальскага дагавора. Ён ствараў юрыдычную базу для цеснага супрацоўніцтва паміж Германіяй і РСФСР у барацьбе супраць міжнароднага парадку, які ўсталяваўся пасля Першай сусветнай вайны. У Цэнтральна-Усходней Еўропе краінай, якая найбольш актыўна выступала ў абарону Версальскай сітэмы, з'яўлялася Польшча. У сілу гэтага барацьба Савецкай Расіі (затым СССР) і Германіі супраць Версаля ў практычнай палітыцы набыла перш за ўсё антыпольскі кірунак. У польскім грамадстве быў шырока распаўсюджаны пункт гледжання, што і Берлін, і Масква маюць рэваншысцкія планы ў дачыненні да Польшчы, і супрацоўніцтва паміж імі стварае рэальную пагрозу для яе тэрытарыяльнай цэласнасці і незалежнасці. Гэта абумовіла вялікую цікавасць польскіх гісторыкаў да савецка-германскіх адносін у перыяд Рапала.

Вывучэнне рапальскай палітыкі ў адносінах паміж Германіяй і Савецкай Расіяй польскімі даследчыкамі пачалося літаральна адразу пасля заключэння дагавора 16 красавіка 1922 г. Навуковыя канцэпцыі тагачасных польскіх гісторыкаў грунтаваліся на поглядах вядучых палітыкаў краіны аб месцы Польшчы ў сістэме еўрапейскіх адносін. Дзеячы як правага

палітычнага лагера, так і левага зыходзілі з таго, што і Германія, і Расія з'яўляюцца ворагамі Польшчы. У 1923 г. выйшла ў свет праца віднага польскага дыпламата А. Скшыньскага. У ёй аўтар агучвае тэзіс, згодна з якім перш за ўсё Германія з'яўляецца непрымірымым ворагам Польшчы ў сувязі з тым, што апошняя актыўна падтрымлівае Версаль [1; 84-85]. Адносіны, якія існавалі паміж Германіяй і Савецкай Расіяй у час Рапала, польскімі дзяржаўнымі дзеячамі характарызаваліся як сяброўскія [2; 141].

Пад уздеяннем такіх поглядаў вядучых палітыкаў міжваеннай Польшчы ў польскай гістарыяграфіі склалася канцэпцыя "двух ворагаў". У адпаведнасці з ёю Савецкая Расія і Германія разглядаліся як асноўныя і небяспечныя праціўнікі Польшчы на міжнароднай арэне. У працах тагачасных даследчыкаў пастаянна падкрэсліваецца агрэсіўнасць СССР і Германіі ў дачыненні да Польшчы, іх імкненне ажыццявіць рэвізію польскіх граніц [3]. Пры гэтым адзначалася, што для Польшчы асабліва небяспечнай з'яўляецца сітуацыя, калі паміж Германіяй і Расіяй усталёўваюцца сяброўскія адносіны. Польскі гісторык міжваеннага часу С. Мацкіевіч пісаў, што, калі расійска-нямецкія адносіны паляпшаюцца, самастойнасць польскай палітыкі спыняецца. Праўда, пры гэтым аўтар прызнае, што Расія і Германія пасля Першай сусветнай вайны і перажытых унутранных патрасенняў у 1920-я гг. не мелі сілаў для знішчэння Польшчы. Гэтым і тлумачыцца, што Польшча змагла захавацца як самастойная дзяржава ў перыяд Рапала [4; 51, 193].

Пасля другой сусветнай вайны паралельна развівалася як бы дзве польскія гістарыяграфіі. Значная частка польскіх гісторыкаў апынулася ў эміграцы на Захадзе. Яны, у цэлым, працягвалі гістарыяграфічную традыцыю, у тым ліку і пры вывучэнні палітыкі Рапала, якая склалася ў міжваенны час. Далейшае развіццё атрымала канцэпцыя "двух ворагаў". Выразным прыкладам гэтага з'яўляюцца працы буйнейшага даследчыка сярод польскіх-гісторыкаў эмігрантаў Побаг-Маліноўскага [5].

Польскія гісторыкі, якія займаліся даследніцкай дзейнасцю ў Польскай Народнай Рэспубліцы (ПНР), знаходзіліся пад ідэалагічным ціскам. Асабліва жорстка рэгламентавалася дзейнасць навукоўцаў, якія вывучалі пытанні, звязаныя з гісторыяй савецка-польскіх адносін. Крытычны аналіз савецкай знешняй палітыкі стаў практычна немагчымым. Знешняя палітыка Польшчы даследавалася на аснове класавага падыходу, і рабілася вынова, што правячыя колы Польшчы ў сваёй знешняй палітыцы кіраваліся не нацыянальнымі, а класавымі інтарэсамі. Многія гісторыкі ПНР увогуле абыходзілі пытанне аб уплыве рапальскага фактара на польска-савецкія адносіны, аб антыпольскай накіраванасці рапальскай палітыкі. Калі ж яны і закранали гэтую праблему, то ўказвалі на неабгрунтаванасць апасенняў правячых колаў Польшчы ў сувязі з заключэннем Рапальскага дагавора. Пры гэтым яны імкнуліся даказаць, што польскі ўрад, заняўшы крайне негатыўную пазіцыю адносна савецка-германскага дагавора, сам садзейнічаў пагаршэнню міжнароднага становішча краіны і, у прыватнасці, адносін з вялікімі суседзямі [6; 101].

Адным з буйнейшых даследчыкаў рапальскай палітыкі у ПНР з'яўляўся С. Мікуліч. Ён лічыў, што Рапала было не больш, чым тактычным ходам з боку Германіі каб умацаваць свае пазіцыі на перамовах з Захадам. У той жа час ён прызнае, што такія германскія палітыкі як У. Брокдорф-Ранцау, Мальцман выступалі прыхільнікамі працяглага і грунтоўнага супрацоўніцтва з Савецкай Расіяй. Ён прытрымліваецца шырока распаўсюджанай сярод польскіх гісторыкаў пазіцыі, што ў выніку пагаднення дзвюх суседніх дзяржаў палітычнае становішча Польшчы істотна пагоршылася. Гэтае пагаршэнне С. Мікуліч бачыць не ў сумеснай антыпольскай палітыцы СССР і Германіі, а ў тым, што Польшча апынулася ў палітычнай ізаляцыі ва Усходняй Еўропе. На яго думку гэта адбылося таму, што і да, і пасля

Рапала Польшча не думала пра блізкае супрацоўніцтва з Савецкай Расіяй [7; 280-281, 289, 305, 308]. Тэзіс аб тым, што Рапальскі дагавор выклікаў моцную заклапочанасць у Польшчы і спрыяў пагаршэнню адносін з РСФСР гучыць і ў даследаваннях Е. Юркевіча. Пры гэтым ён падкрэслівае, што савецкая дыпламатыя завярала ў адсутнасці антыпольскай накіраванасці ў гэтым дагаворы [8; 28]. Польскія гісторыкі розных кірункаў практычна аднадушныя ў тым, што заключэнне Рапальскага дагавора было ўспрынята ў Польшчы з яўнай трывогай, і ён пагоршыў польска-савецкія адносіны і міжнароднае становішча гэтай краіны. У той жа час Е. Куманіцкі адзначае, што нямецкія спробы прыцягнуць Савецкую Расію да антыпольскай палітыкі закончыліся нічым, і, зыходзячы з такой пазіцыі савецкага ўраду, Рапала не мела непасрэднай пагрозы для Польшчы [9; 255]. М. Камінскі і М. Захарыас у сумеснай манаграфіі таксама выказваюць меркаванне, што сам Рапальскі дагавор не ствараў непасрэднай пагрозы для Польшчы, але ён аслабляў Версальскую сістэму і адкрываў Германіі свабоду манёўру ў адносінах з Захадам, што супярэчыла інтарэсам Польшчы [10; 84]. Вызначаючы прычыны, якія прывялі да падпісання Рапальскага дагавора, С. Мікуліч піша: "Гісторык павінен ...паставіць сябе пытанне: ці не няшчырасць і палітычны фальш польскага ўраду ў адносінах да Савецкай Расіі ...належаць да прычын, якія прымусілі Савецкую Расію да падпісання Рапальскага пагаднення?" Аўтар дае станоўчы адказ на пастаўленае пытанне і тым самым ускладае на польскія правячыя колы адказнасць за тое, што РСФСР пайшла на цеснае супрацоўніцтва з Германіяй [11; 206].

Гісторыкі ПНР выразна супрацьпастаўлялі савецкую і германскую палітыку ў дачыненні да Польшчы. Рэваншысцкія планы прыпісваліся выключна Германіі. Вядомы даследчык польска-савецкіх адносін міжваеннага часу Е. Куманіцкі пісаў, што мэты, якія праследаваў савецкі ўрад пры заключэнні Рапальскага дагавора, карэнным чынам адрозніваліся ад мэтаў буржуазнай Германіі [9; 253]. Гісторыкі ПНР указвалі на імкненне перш за ўсё кіраўніцтва рэйхсвера выкарыстаць Рапала супраць Польшчы. У той жа час адзначаецца, што ў Савецкай Расіі такіх намераў не было [7; 316-317]. Е. Куманіцкі ў гэтай сувязі заўважаў, што заклапочанасць Польшчы ў сувязі з падпісаннем Рапальскага дагавора не была беспадстаўнай, бо такія германскія палітычныя дзеячы, як канцлер Ё. Вірт і камандуючы рэйхсверам генерал фон Сект выступалі за ліквідацыю Польшчы. Е. Красуцкі адзначаў, што Германія была вельмі зацікаўлена ў польска-савецкай вайне, бо гэта давала ёй магчымасць заняць заходнепольскія землі пад падставай іх абароны ад камунізму [12; 430]. Напружанае становішча ў адносінах міжваеннай Польшчы з Савецкай Расіяй (СССР) польскімі гісторыкамі-марксістамі тлумачылася перш за ўсё як наступства польскай агрэсіі ў 1919–1920 гг. Адпаведна, віна за такі стан польска-савецкіх адносін ускладалася выключна на правячыя колы Польшчы, якія ў сваёй палітыцы кіраваліся класавымі інтарэсамі [13; 11].

Некаторыя гісторыкі, працаваўшыя ў ПНР, адзначалі, што ў выніку заключэння Рапальскага дагавора з'явіліся некаторыя перадумовы для паляпшэння адносін Польшчы з Германіяй і Савецкай Расіяй. Яны звязваюць гэта з тым, што суседзі Польшчы, наладжваючы цеснае супрацоўніцтва, былі зацікаўлены ў выкарыстанні праходзячых праз яе тэрыторыю транзітных шляхоў, а для гэтага трэба было мець добрыя адносіны з Польшчай [7; 321].

Польскія гісторыкі шмат увагі надавалі вызначэнню ўплыву на міжнароднае становішча Польшчы савецка-германскага Берлінскага дагавора аб нейтралітэце ад 24 красавіка 1926 г. Г. Корчык указвае, што польскі міністр замежных спраў А. Залескі прызнаў мірны характар гэтага дагавора, але пры гэтым аўтар адзначае, што дагавор нёс пэўную пагрозу для Польшчы. Яна бачыцца перш за ўсё ў тым, што ён даваў магчымасць Германіі забараніць праход праз сваю тэрыторыю войскаў дзяржаў – членаў Лігі Нацый на дапамогу Польшчы ў выпадку канфлікта з СССР [14; 308.]. Як выразную пагрозу для Польшчы ацэньваюць Берлінскі дагавор у сваёй працы М. Камінскі і М. Захарыас [10; 102].

*Польскія гісторыкі марксісцкага кірунку звярнуліся ў сваіх даследаваннях* і да праблемы ўплыву стану савецка-германскіх адносін на польска-германскія і польска-савецкія. Пры гэтым адзначалася, што Германія актыўна супрацьдзейнічала магчымасці польска-савецкага збліжэння. С. Лапатнік разглядае ход савецка-польскіх перамоў аб дагаворы аб ненападзе ў 1925-1926 гг. і паказвае, што германскі ўрад пастаянна праяўляў заклапочаннасць у сувязі з савецка-польскімі прамовамі і імкнуўся не дапусць заключэння пагаднення [15; 70]. З. Вроняк адзначаў, што немцы праяўлялі яўную заклапочанасць у сувязі з тым, што на савецка-польскіх палітычных перамовах у пачатку 1926 г. справа можа дайсці да заключэння дагавора. Сведчаннем гэтага з'яўляецца тое, што германскі пасол у Маскве У. Брокдорф-Ранцау па даручэнню міністра замежных спраў Г. Штрэземана спецыяльна звяртаўся да наркама замежных спраў Г. Чычэрына за тлумачэннямі адносна савецка-польскіх перамоў [16; 497-498].

У канцы 1980-х гг. гісторыкі, якія працавалі ў Польшчы, атрымалі магчымасць для *свабоднай даследніцкай працы*. Польская гістарыяграфія ў новых умовах засталася вернаю тэзісу аб адмоўным уплыве Рапальскага дагавора на міжнароднае становішча Польшчы, аб абгрунтаванасці польскай заклапочаннасці ў сувязі з яго падпісаннем. Асноўны акцэнт пры гэтым рабіўся на тое, што Рапала паскорыла карозію Версальскай сістэмы, у захаванні якой была зацікаўлена Польшча. Віна за такое разгортванне падзей ускладаецца некаторымі даследчыкамі на Англію, якая не выступіла рашуча супраць Рапала, бо не хацела абвастраць адносіны з Германіяй і разлічвала адарваць яе ад Расіі [17; 77]. Пры гэтым у працах польскіх гісторыкаў атрымала далейшае развіццё думка, што Германія прымала ўсе меры каб не дапусціць паляпшэння польска-савецкіх адносін, а СССР – польска-германскіх. Р. Ласоўскі пісаў на гэты конт: "Немцы былі зацікаўлены, каб савецка-польскія адносіны складваліся як мага хужэй... Трэба адзначыць, што савецкі бок думаў гэтак жа аб польска-германскіх адносінах" [18; 220]. Паколькі для сучаснай польскай гістарыяграфіі з'яўляецца відавочнай пагроза для Польшчы ў выніку германа-савецкага супрацоўніцтва, яна робіць лагічны вывад, што галоўнай аксіёмай польскай знешняй палітыкі ў час Рапала было змяншэнне небяспекі з боку Германіі і Савецкай Расіі. Гэтая небяспека вынікала з таго, што дадзеныя краіны, цесна супрацоўнічаючы паміж сабою, хутка аднаўлялі сваю эканамічную і ваенную магатнусць. Гэта, як лічаць польскія гісторыкі, у той час прадстаўляла пагрозу для ўсіх краін рэгіёну, але перш за ўсё для Польшчы з-за яе геаграфічнага становішча [19; 53-54].

Усё ж не ўсе польскія гісторыкі адназначна адмоўна ацэніваюць уплыў Рапальскага дагавора на знешнепалітычнае становішча Польшчы. Напрыклад, Е. Красускі лічыць, што з яго заключэннем, а затым і з заключэннем Берлінскага дагавора аб нейтралітэце Англія перастала разглядаць Германію як важнейшы бастыён антыкамунізма. У сілу гэтага яна вымушана была больш лічыцца з Польшчай як з сілаю, якая прыкрывае Еўропу ад бальшавіцкай пагрозы [12; 420].

Г. Булхак адзначае, што Рапала істотна паўплывала на абарончую палітыку Польшчы і яе ўзаемаадносіны з саюзнікамі. Польскія правячыя колы прыйшлі да высновы, что канфлікт з адным з вялікіх суседзяў непазбежна прывядзе да ўмяшання другога, да вайны на два франты. У сувязі з гэтым яны сталі імкнуцца да аб'яднання польска-французскага і польска-румынскага саюзаў у адзіную кааліцыю, якая магла б супрацьстаяць саюзу Германіі і Савецкай Расіі [20; 108-109].

У гэты час многія гісторыкі, якія раней прытрымліваліся марксісцкай метадалогіі, перайшлі на іншыя метадалагічныя пазіцыі. Гэта знайшло адлюстраванне і ў тых ацэнках, якія яны *выказваюць адносна Рапальскага дагавора. Так, Е. Куманіцкі цяпер адзначае, што істотныя* праблемы ў польска-савецкіх адносінах вынікалі з самога факту заключэння Рапальскага дагавора, бо ў ім бачылі вострую накіраванасць супраць Польшчы. Аўтар лічыць, што турбота польскага грамадства адносна савецка-германскага супрацоўніцтва не была

беспадстаўнай. Пры гэтым ён указвае на яўна агрэсіўную пазіцыю ў дачыненні да Польшчы шэрагу як германскіх (Вірт, фон Сект), так і савецкіх (Л. Троцкі) дзяржаўных дзеячаў [21; 145-149]. Хаця, тут ёсць пэўныя нюансы ў вызначэнні пазіцый СССР і Германіі. Некаторыя даследчыкі адзначаюць, што Савецкая Расія не выступала афіцыйна з рэвізіяніісцкімі патрабаваннямі адносна польскіх граніц. Тым не менш, па іх меркаванню, пагроза для Польшчы зыходзіла і з усходу [22; 84]. Даказваючы гэты тэзіс, польскія гісторыкі спасылаюцца, у прыватнасці, на ход савецка-германскіх палітычных перамоў у канцы 1924 г., у час якіх савецкая дыпламатыя не адвергла германскую прапанову "аб вяртанні Польшчы да яе этнічных граніц" [21; 149-150]. У цэлым, польскія гісторыкі пасля падзення камунізму ў краіне прыйшлі да агульнай пазіцыі, што Рапальскі дагавор стаў асноўнай прычынай крызісу ў савецка-польскіх адносінах на працягу значнага часу [23; 273].

Вялікую цікавасць у польскіх гісторыкаў у розны час выклікала пытанне германа-савецкага ваеннага супрацоўніцтва ў час Рапала. Факты такога супрацоўніцтва адзначала ўжо ў 1920-я гг. як польская прэса, так і навукоўцы. У ПНР гэтая тэма фактычна знаходзілася пад забаронай. Толькі асобныя гісторыкі закраналі яе ў сваіх працах. Праўда, пры гэтым яны не сцвярджалі, што такое супрацоўніцтва мела месца, а толькі ўказвалі, што так лічылі польскія ваенныя і ўрад [24; 71-73]. У 90-я гг. XX ст. праблема германа-савецкага ваеннага супрацоў-ніцтва стала прадметам грунтоўнага даследавання. Як адзначаюць сучасныя польскія гісторыкі, палякам было вядома пра факты такога супрацоўніцтва яшчэ да падпісання Рапальскага дагавора, з 1920 г. Дыскусійным застаецца пытанне аб наяўнасці ваеннага пагаднення паміж Германіяй і Савецкай Расіяй. М. Лечык сцвярджае, што 3 красавіка 1922 г. гэтыя дзве краіны падпісалі дагавор, які развівае палажэнні ваеннай канвенцыі, падпісанай імі яшчэ 25 сакавіка 1921 г. Ён прыводзіць тэкст гэтага дагавора са спасылкай на Дзяржаўны архіў у Патсдаме [19; 60-62].

Фундаментальнай абагульняючай працай па польскай дыпламатычнай гісторыі міжваеннага часу стала "Гісторыя польскай дыпламатыі" [25]. У ёй знайшлі адлюстраванне найноўшыя даследаванні польскіх гісторыкаў па гісторыі міжнародных адносін, у тым ліку і па рапальскай палітыцы. У аснове іх канцэпцыі тэзіс, згодна з якім стратэгічнай мэтай як савецкай, так і германскай палітыкі ў дачыненні да міжваеннай Польшчы была рэвізія польскіх граніц. Гаворачы пра сучасны стан польскай гістарыяграфіі, трэба адзначыць, што для многіх польскіх гісторыкаў характэрна празмерная эмацыянальнасць у ацэнках міжнароднага становішча Польшчы. Не ўсе з іх праяўляюць дастатковую аб'ектыўнасць пры ацэнцы знешнепалітычных інтарэсаў Польшчы, СССР, Германіі ў 20-я гг.XX ст.


1. Skrzynski Al. Polska a pokoj. - Warszawa, 1923.
2. Sikorski Wl. Polska i Francja. – Lwow, 1931.
3. Grzymala-Grabowiecki J. Polityka zagraraniczna Polska w roku 1924. – Warschawa, 1925.
4. Mackiewicz S. Historja Polski od 11 listopada 1918 r. do 17 wrzesnia 1939 r. – Wroclaw, 1986.
5. Pobog-Malinowski W. Najnowsza historia polityczna Polski. – T. 2. – Cz. I. – London, 1956.
6. Дашкевич В. Польско-советские отношения. 1921–1932 // Очерки истории советско-польских отношений (1917–1977). – М., 1979.
7. Mikulicz S. Od Genui do Rapallo. – Warszawa, 1966.
8. Jurkewicz J. Niektore problemy stosunkow polsko-radzieckich w okresie miedzywojennym. 1918-1939 // Z dziejow stosnkow polsko-radzieckich. Studia i materialy. T. 2. – Warszawa, 1986.
9. Kumaniecki J. Wobec ukladu w Rapala // Z dziejow stosnkow polsko-radzieckich. Studia i materialy. T. 2. – Warszawa, 1986.
10. Kaminski M., Zaharias M. Polityka zagraniczna II Rzeczypospolitej. 1918–1939. – Warszawa, 1986.
11. Mikulicz S. Polityczne manewry polskiej dyplomacji przed konferencja w Genui. 1922 // Studia z najnowszych dziejow powczechnych. - Warszawa, 1963.

12. Krasucki J. Polska i Niemcy: Dzieje uzojemnych stosunkow politycznych (do 1932 r.). – Warszawa, 1989
13. Zarnowski J. Sasiedzi wielcy i mali // Przyjaznie i antagonizmy. Stosunki Polski z panstwami sasiednimi w latach 1918 – 1939. – Wroclaw – Warszawa – Krakow – Gdansk. – 1977.
14. Korczyk H. Polska dyplomacja wobec traktatu berlinskiego z 1926 r. w swiatle dokumentow // Przeglad historyczny. – 1983. - № 2.
15. Lopatniuk S. Polska-radzieckie rokowania w sprawie zawarcia paktu o niagresji // Z dziejow stosnkow polsko-radzieckich. Studia i materialy. – Warszawa, 1965. – T. 1.
16. Wroniak Zd. Uchwaly Lokarnskie a problem radziecko-nimiecki w polskiej polityce zagranicznej // Polska. Niemcy. Europa. – Poznan, 1977.
17. Balcerak W. Miejsce i rola Polski w systemie wersalskij // Rola i miejsce Polski w Europie 1914 – 1957. – Warszawa, 1994.
18. Lossowski P. Polska w Europie i swiecie 1918-1939. Szkice z dziejow polityki zagranicznej polozenia mindzynarodowego II Rzeczypospolitej. – Warszawa, 1990.
19. Leczyk M. Wojskowe aspekty polskiej polityki wschdniej w latach 1922-1925 // Dzieje najnowsze. – 1993. 2. – R. XXV.
20. Bulnak H. Konferencja wojskowa polsko-rumynsko-francuska w Warszawie (7-8. IV.1924) // Studia z dziejow ZSRR i Europy Srodkowej. – 1990. – T. 25.
21. Kumaniecki J. Polski aspekt stosunkow radziecko-niemieckich w 1922 r. // Przeglad historyczny. T. LXXXI, zeszyt 1-2. – Warszawa, 1990.
22. Garlick A. Utrzymanie pokoju i status quo – zasada polityki II Rzeczypospolitej // Rola i miejsce Polski w Europie 1914–1957. – Warszawa, 1994.
23. Kochanowski J. Miedzu dyplomacja a wywiadem. Dzialalnosc Romualda Walikowskiego i Ignacego Boernego jako attaches wojskowych w Moskwie (1921-1924) // Przeglad historyczny. T. LXXXI, zeszyt 1-2. – Warszawa, 1990.
24. Stawecki P. Polityka wojskowa Polski. 1921–1926. – Warszawa, 1981.
25. Historia dyplomacji polskiej. T. IV. 1918-1939. – Warszawa, 1993.

*Зеленевский В. А. (г. Минск, Ин-т философии НАН Беларуси)*

## К ВОПРОСУ ОБ ИСТОРИИ ГЕРМАНСКОГО МАСОНСТВА И ЕГО РОЛИ В СУДЬБЕ А. С. ПУШКИНА

> «Англия, Америка, Германия. . рассадники франкмасонства. Эти страны чувствуют в себе мессианское призвание вместе с иудейством овладеть миром и затем уже передать его еврейскому лжемессии, зверю...»
>
> Св. прав. о. Иоанн Кронштадтский.

Германские тайные общества, чаще именуемые масонством (академии, союзы, ордена, ложи, элитарные клубы...) имеют пребогатую историю. Рамки выступления не позволяют охватить данный вопрос во всём его объёме. Поэтому остановимся лишь на некоторых из наиболее рельефных его аспектов.

Строго говоря, термин "масонство" (применительно к каким бы то ни было тайным обществам) совершенно не научный. Дело в том, что "масонство" или "франкмасонство" означает "вольные" или "свободные каменщики". Так в средние века назывались артели строителей храмов, замков, крепостей... Собственно же тайные общества существовали задолго до Рождения Христова и имели свои собственные названия, как то – фарисеи, саддукеи, жреческие касты древних Вавилона, Египта и т. п., позднее же – гностики, манихеи, альбигойцы, тамплиеры, вальденсы, розенкрейцеры, иллюминаты, мартинисты и другие. Патентованный не-